# Біяграфіі

**Валянцін Акудовіч** (нар.у 1950) — філосаф-постмадэрніст, паэт. Літаратурны крытык, публіцыст; культавая постаць беларускага інтэлектуальнага жыцця другой паловы 90-х гадоў XX ст.; намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Фрагменты”. Аўтар кніг “Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека” (Менск 1998), а таксама “Код адсутнасці”, “Асновы беларускай ментальнасці” (Менск 2007), у якой адказвае на пытанні, чаму Беларусь не апынулася ў месцы, якое беларускія інтэлектуалы прыдумалі сабе ў пачатку 90-х гадоў; эсэ: “Дыялогі з Богам”, “Вайна культур”, “Архіпелаг Беларусь”, “Беларусь як постмадэрнісцкі праект Бога”.

**Алесь Анціпенка** (нар.у 1953) — медыязнаўца, па адукацыі лінгвіст і філосаф. Працаваў настаўнікам і перакладчыкам з французскай і англійскай мовы. Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў і Беларускага ПЭН-клуба. Аўтар шматлікіх аналітычных артыкулаў на тэму беларускіх СМІ і ментальнасці, а таксама кніг: “Медыі і тэорыя камунікацыі” (Менск-Вільня, 2000), “Невядомая Беларусь, Еўрапейскі Выбар Беларусі. Сцэнар рэформ” (Варшава, 2003-04).

**Уладзімір Арлоў** (нар. у 1953) — пісьменнік, публіцыст, аўтар твораў на тэму гісторыі Беларусі. Выпускнік факультэта гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў настаўнікам ў школе, быў рэдактарам газеты “Хімік”, з 1988 г. на пасадзе рэдактара часопіса “Мастацкая літаратура”, з 1989 г. віцэ-старшыня беларускага ПЭН-клуба. Аўтар звыш 20 зборнікаў прозы, двух тамоў паэзіі і шэрагу кніг, якія папулярызуюць нашу гісторыю. З’яўляецца адным з найбольш чытаных беларускіх пісьменнікаў.

**Лявон Баршчэўскі** (нар.у 1958) — перакладчык, літаратуразнаўца. Вучыўся ў Педагагічным інстытуце ў Менску (спецыяльнасць замежныя мовы: англійская і нямецкая). Перакладчык на беларускую мову мастацкай літаратуры з нямецкай, польскай, чэскай і нідэрландскай моваў. Сузаснавальнік Беларускага гуманітарнага ліцэю, дзе навучальнай мовай была беларуская. У 1990-95 гадах — дэпутат. Сузаснавальнік Беларускага Народнага Фронту. Ад снежня 2007 году — старшыня Партыі БНФ.

**Генадзь Бураўкін** (нар. у 1936) – журналіст, пісьменнік, паэт. Выпускнік журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Першыя вершы апублікаваў у 1952 годзе. Працаваў рэдактарам у часопісе "Камуніст Беларусі" і на Беларускім радыё. У 1972-78 гадах быў карэспандэнтам газеты "Праўда" па Беларусі. З 1978 па 1990 г. – старшыня Дзяржкамітэта па тэлебачанню і радыё. У 1980-90 гадах – дэпутат Вярхоўнага Савета, у 1990-94 гадах – прадстаўнік БССР, а пасля Рэспублікі Беларусь пры ААН.

**Адам Глобус** (сапр. Уладзімір Адамчык, псеўд. Джон Томпсон, нар. у 1958) – пісьменнік і паэт, выпускнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Працаваў мастаком, рэстаўратарам, рэдактарам. Цяпер займаецца выдавецкай справай (выдавецтва «Сучасны літаратар»). З'яўляецца сябрам Саюзу пісьменьнікаў Беларусі з 1989 году. Адзін з вядучых прадстаўнікоў сучаснай беларускай літаратуры, скандальную славу здабыў зборнікам эратычных апавяданняў "Дамавікамерон" (1994) і яго працягам "Новы Дамавікамерон" (1998).

**Павел Якубовіч** (нар. у 1946) – журналіст, галоўны рэдактар прапрэзідэнцкай газеты "Беларусь Сегодня" (раней "Советская Белоруссия"). У 1972 г. скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1975 г. ваенную школу МУС ім.Дзяржынскага ў Саратаве. У 1965-77 гадах салдат унутраных войскаў МУС СССР. У 1977-87 гадах – загадчык аддзела газеты "Знамя юности", у 1987-95 гадах – рэдактар аддзела часопіса "Крыніца". Са студзеня па ліпень 1995 г. намеснік галоўнага рэдактара "Советской Белоруссии", з 11 ліпеня 1995 г. галоўны рэдактар. За матэрыялы, прысвечаныя падзеям жніўня 1991 года адзначаны міжнароднай журналісцкай прэміяй «Золотое перо» за абарону дэмакратыі. Атрымаў ад Аляксандра Лукашэнкі прэмію «За духоўнае адраджэнне».

**Андрэй Ляховіч** (нар. у 1970) – палітолаг, аналітык. Выпускнік факультэта паліталогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе незалежным аналітыкам, вядзе Цэнтр палітычнай адукацыі. Аўтар шматлікіх артыкулаў, якія тычацца палітычнай сітуацыі ў Беларусі, і кніг: "Беларуская палітычная сістэма і прэзідэнцкія

выбары” (Варшава, 2001), “Беларусь: сцэнар рэформ. Еўрапейская дарога Беларусі” (Вашынгтон, 2003), “Гісторыя беларускага парламентарызму” (Менск, 2005).

**Алег Манаеў** (нар. у 1952) – сацыёлаг, аналітык. У 1974 г. закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1994 г. атрымаў званне прафесара сацыялогіі; у 1992-99 – прафесар кафедры сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1992 г. – дырэктар Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў. Суаўтар кніг пра праблемы медыяў і дэмакратыі.

**Пётр Марцаў** (нар. у 1962) – журналіст. Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў школе для працоўнай моладзі. У 1986-88 гадах – карэспандэнт БЕЛТА. Карэспандэнт газеты “Коммерсант” у Беларусі. З 1992 г. займаўся бізнесам, выдаваў газету “Биржи и банки: Белорусская деловая газета” (з 1999 года – “Белорусская деловая газета”), штотыднёвік “Имя”. З 2002 г. – выдавец “Белорусской деловой газеты” і «БДГ. Для служебного пользования». Прадзюсер і адзін з аўтараў сцэнару да фільма пра Аляксандра Лукашэнку “Обыкновенный президент” (1996). Узнагароджаны ганаровым дыпломам “За ўмацаванне свабоды слова ў Беларусі”. Уваходзіў у дваццатку самых уплывовых прадстаўнікоў мас-медыя краін СНД (2001).

**Павал Севярынец** (нар. у 1976) – стваральнік і лідэр “Маладога Фронту”, стваральнік БХД. У 2000 г. скончыў факультэт геаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2005 годзе асуджаны да 3 гадоў абмежавання волі за вулічныя пратэсты супраць афіцыйных вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндума, які даў права Аляксандру Лукашэнка балатавацца на пасаду прэзідэнта неабмежаваную колькасць разоў. Пакаранне адбываў на “хіміі”, у вёсцы Малое Сітна, дзе працаваў на мясцовым тартаку. Падчас ссылкі паўстала кніга “Лісты з лесу”.

**Валянцін Тарас** (нар. у 1930) – паэт, пісьменнік, перакладчык літаратуры. Піша па-руску і па-беларуску. Падчас ІІ сусветнай вайны, ва ўзросце 13 гадоў пайшоў у партызанскі атрад. Змагаўся з фашыстамі ў брыгадзе ім. Чкалава. У 1955 г. скончыў факультэт журналістыкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. У 1955-62 гадах працаваў у рэдакцыі газеты "Звезда". У 1964-68 гадах быў рэдактарам часопіса "Нёман". Першыя вершы апублікаваў у 1948 г. (пісаў па-руску і па-беларуску). Сябра Саюзу беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтру. Аўтар кніг паэзіі ("Две тетради", "Пазыцыя", "Колеры"і інш.), прозы ("Прощальные костры", "Дань времени"), мемуараў ("На высьпе ўспамінаў").

**Алег Трусаў** (нар. у 1954) – археолаг, кандыдат гістарычных навук, гісторык беларускай архітэктуры, адзіны ў краіне выкладчык гісторыі філатэліі Беларусі. Палітык і грамадскі дзеяч, адзін са стваральнікаў, а зараз старшыня Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета ХІІ склікання. Удзельнічаў у галадоўцы дэпутатаў апазыцыі БНФ 11—12 красавіка 1995 году супраць арганізаванага Аляксандрам Лукашэнкам рэфэрэндуму аб скасаванні бел-чырвона-белага сцяга, гербу «Пагоні» ў якасці дзяржаўных сімвалаў, скасавання статусу беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай мовы і эканамічнай інтэграцыі з Расіяй.

# Змест

**Уступ**

**Гісторыя без герояў**
РАЗМОВА З УЛАДЗІМІРАМ АРЛОВЫМ ................................. 5

**І ўбачылі Беларусь**
РАЗМОВА З ЛЯВОНАМ БАРШЧЭЎСКІМ ............................. 19

**Я бараніў савецкую Беларусь**
РАЗМОВА З ВАЛЯНЦІНАМ ТАРАСАМ ....................................37

**Мы былі пакорнымі. На жаль**
РАЗМОВА З ГЕНАДЗЕМ БУРАЎКІНЫМ ................................ 53

**Выпадкі Паўла Ізотавіча**
РАЗМОВА З ПАЎЛАМ ЯКУБОВІЧАМ ......................................67

**Партызан-антыгерой**
РАЗМОВА З АЛЕСЕМ АНЦІПЕНКАМ.....................................81

**Беларусь будзе краінай некалькіх моў**
РАЗМОВА З АЛЕГАМ ТРУСАВЫМ ......................................... 93

**Мы маем дзве душы**
РАЗМОВА З АДАМАМ ГЛОБУСАМ .......................................107

**Бог нічога добрага для іх не зрабіў**
РАЗМОВА З ПАЎЛАМ СЕВЯРЫНЦАМ .................................121

**Мы ўжо змучаныя**
РАЗМОВА З ВАЛЯНЦІНАМ АКУДОВІЧАМ .......................... 135

**За Беларусь**
РАЗМОВА З АНДРЭЕМ ЛЯХОВІЧАМ .................................. 147

**У Еўропу – так, але з нашай расійскай спадчынай**
РАЗМОВА З ПЯТРОМ МАРЦАВЫМ .................................... 159

**Беларусы не разумелі, у імя якіх каштоўнасцей яны павінны былі пакутаваць**
РАЗМОВА З АЛЕГАМ МАНАЕВЫМ...................................... 171

**Біяграфіі** .......................................................................................... 184